# Праўда і памяць – саюзніцы

**Спачатку было слова? Не, спачатку была задума. Вядомая журналістка Таццяна Падаляк прапанавала пад эгідай газеты «Звязда» і Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» ажыццявіць акцыю «Нашчадкі вогненных вёсак». Па сутнасці, яна задумала зрабіць працяг славутай кнігі «Я з вогненнай вёскі...» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка.**

Тая кніга – кніга-памяць, дакументальная хроніка, жывы голас людзей, якія былі спалены са сваёй вёскай, са сваёй сям'ёй, – была напісана праз 30 гадоў пасля вайны. Прайшло яшчэ 30 гадоў. Многіх Сведкаў Праўды, як назвалі сваіх суразмоўцаў пісьменнікі, ужо няма. І ўсё ж сведкі той жудаснай трагедыі яшчэ застаюцца. У пачатку 1970-х, калі Алесь Адамовіч, Янка Брыль і Уладзімір Калеснік працавалі над кнігай, яны запісвалі пераважна ўспаміны людзей, якія ў гады вайны былі сталымі, дарослымі. Ды жыццё чалавека не вечнае. На пачатку ХХІ стагоддзя ў жывых засталіся сапраўды апошнія сведкі. У вайну яны былі дзецьмі ці падлеткамі. Надзвычай важна пачуць іх галасы. Перад памяццю ахвяр. Перад складаным лёсам людзей, якія перажылі нечалавечую ваенную трагедыю. Перад пакаленнем Пераможцаў і перад будучыняй. Каб помніць!




Кніга журналісткі Таццяны Падаляк «Нашчадкі вогненных вёсак» створана па матэрыялах аднайменнай акцыі рэдакцыі газеты «Звязда» і пры падтрымцы Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Патрыятычная ініцыятыва газеты «Звязда» і ДМК «Хатынь» выклікала вельмі шырокі водгук-розгалас у грамадстве. Беспрэцэдэнтная зваротная сувязь: у рэдакцыю пайшлі пісьмы і тэлефонныя званкі ад сведкаў, відавочцаў жудасных ваенных падзей. Актыўны ўдзел у акцыі бралі школьнікі, студэнты, настаўнікі, краязнаўцы з усёй Беларусі. Распачатая работа закранула за жывое. Больш як праз паўстагоддзя пасля вайны людзі сведчылі: мэтанакіраваная нацысцкая палітыка генацыду ў адносінах да насельніцтва Беларусі стала велізарнай нацыянальнай трагедыяй.

Публікуючы на сваіх старонках матэрыялы акцыі «Нашчадкі вогненных вёсак», найстарэйшая беларуская газета, якая ў час Вялікай Айчыннай вайны выдавалася ў мінскім падполлі, потым – у партызанскай зоне, яшчэ раз пацвердзіла: на тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія акупанты вялі вайну на знішчэнне. Тры чвэрці насельніцтва падлягала «высяленню» з роднай зямлі, гэта значыць фізічнаму знішчэнню. Чвэрць – «анямечванню», ператварэнню ў рабоў.

Больш за 9200 беларускіх вёсак знішчылі акупанты. З іх 5295 спалілі разам з людзьмі. 628 вёсак падзялілі лёс Хатыні. 186 загінулых у полымі разам з жыхарамі вёсак так і не былі адноўлены пасля вайны, не адрадзіліся... Спаленыя разам з людзьмі вёскі – трагічны сімвал Беларусі, сведчанне нацысцкага генацыду супраць беларускага народа ў Другой сусветнай вайне.

Гэтыя лічбы і факты – пераканаўчы і доказны адказ розным фальсіфікатарам гісторыі вайны. Тым не дужа сумленным публіцыстам, якія ў параксізме антысаветызму гатовы ўсё перавярнуць з ног на галаву. Вось і атрымліваецца ў іх, што падчас Вялікай Айчыннай вайны было проціборства дзвюх абсалютна аднолькавых бесчалавечных ідэалогій – фашызму і камунізму, што ніякага народнага парыву абараніць Айчыну, а разам з ёй і ўсё чалавецтва ад карычневай чумы не было. Не толькі на старонкі перыядычных выданняў, але і ў мастацкія творы, кінафільмы, жывапісныя карціны мутнай і настырнай плынню хлынулі сюжэцікі пра СМЕРШы, бяздарнасць, дурноту і жорсткасць савецкіх франтавых камандзіраў; сапраўднымі монстрамі паўставалі партызаны – арганізаваныя бандыты, якія рабавалі і забівалі мірных жыхароў, а вось немцы і паліцаі выступалі ў якасці самаахвярных абаронцаў бедных абарыгенаў. Дайшло да таго, што крывавы кат беларускага народа Вільгельм Кубэ стаў выстаўляцца палітычным і духоўна-культурным апосталам акупаваных беларускіх зямель, шчырым абаронцам беларусаў ад самавольства кіраўнікоў Трэцяга рэйха. І зусім не рупіліся нашы публіцысты-рэвізіяністы (дакладней было б назваць іх марадзёрамі), каб хоць неяк аргументаваць уласныя высновы. Была Перамога? Быць-то яна была, мармычуць праз зубы рэвізіяністы, але дасягнута пры дапамозе загараджальных атрадаў, штраф-


Ганна Браткоўская і яе сястра Аляксандра са Случчыны – адны з гераінь кнігі

ных батальёнаў і рот. Ці ж варта дзівіцца, што на старонках асобных сучасных твораў аб Вялікай Айчыннай вайне, прынамсі многіх з іх, пануе вельмі жорсткая атмасфера. Ніякіх праяў чалавечнасці, паўсюль – зверствы, зверствы і яшчэ раз зверствы. І не даходзіць да свядомасці пісьменнікаў, што такім чынам нельга дасягнуць хоць бы якой пераканальнасці: лішак чарнаты (ды яшчэ калі гэта разыходзіцца з гістарычнай праўдай) забівае мастацкі твор. Трэба мець на ўвазе і гэта: вялікія перамогі застрашанымі людзьмі не здзяйсняюцца. А яшчэ хацелася б параіць няўрымслівым ды не вельмі дасведчаным (хочацца верыць, што свядомых ачарняльнікаў подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне ў нас няма) часцей заглядваць у кнігі накшталт «Нашчадкі вогненных вёсак».

Учытайцеся. Удумайцеся.

*...А мама наша аслабела, не можа ісці. «Што мне рабіць з вамі? Не ўцяком. Хай ужо паб'юць. Хоць гора гэта скончыцца. Не будзем мучыцца», – гаворыць і плача... А брацік Юлік, яму восем тады было, пайзе апошнім і рукою снег замятае, каб не знайшлі тыя вылюдкі нас. Так і ўратаваліся. Вярнуліся пасля ў вёску – усё начыста спалена. Як жыць?.. Тады з голаду памерла і наша Нінка.*

**Таццяна Курловіч,**
**вёска Свяціца Ляхавіцкага раёна.**

*...Сярод галавешак ляжалі трупы людзей, маіх аднавяскоўцаў. Загінулі Літвічы... Такая прыгожая вёска была, нібы намаляваная на карцінцы.*

**Уладзімір Жаваранак,**
**вёска Літвічы Лагойскага раёна.**

*У тым годзе вырасла вельмі высокае жыта – у рост чалавека, гэта і выратавала жыццё: немцы доўга стралялі па жыце, спадзеючыся нас забіць...*

**Віктар Жарэла,**
**вёска Лозкі Калінкавіцкага раёна.**

*Пойдзем, бывала, з мамай па чарніцы і знаходзім косці людзей, забітых пры расправе над вёскай. Занясём на могілкі ды закапаем...*

**Марыя Богдан,**
**вёска Ніўкі Лагойскага раёна.**

*...Не даюць спакою страшныя ўспаміны. Летась адважыўся напісаць ліст канцлеру ФРГ Ангеле Меркель. Выплачвалі ж немцы кампенсацыі вязням фашысцкіх канцлагераў. А я ж пеpажыў не менш, чым яны. Адказ прыйшоў хутка. Сказана было ў ім, што мая просьба не падпадае пад нямецкае заканадаўства і да таго ж празмерная... Уласна, справа не ў грашах і іншых матэрыяльных дабротах. Колькі гадоў прайшло, а ў душы маёй няма таго прымірэння, аб якім так многа цяпер гавораць...*

**Іван Лiневіч,**
**вёска Пераходы Слуцкага раёна.**

*...У адным пакоі ляжала мёртвая маці з грудным братам. Іх перасекла аўтаматная чарга ў той момант, калі маці карміла дзіця. У другім пакоі я ўбачыў забітых бацьку і старэйшага брата.*

**Васіль Сакадынец,**
**вёска Боркі Кіраўскага раёна.**

*Я стала свядомым чалавекам, настаўніцай, а мае сяброўкі-аднагодкі загінулі, як растаптаныя кветачкі, нават не паспеўшы раскрыць свае пялёсткі. А кім бы яны сталі?..*

**Данута Шаўлоўская,**
**вёска Янушкавічы Валожынскага раёна.**

Ёсць у кнізе і іншыя ўражальныя эпізоды і ўспаміны пра мінулую вайну і пакуты, што прымушаюць сціскацца сэрца. Іх можна было б прыводзіць і прыводзіць, але справа не ў гэтым. І так зразумела: Таццяна Падаляк стварыла кнігу з такога матэрыялу, які ніколі не састарэе, кніга гэта застанецца актуальнай, бо пакуль будзе жывым сумленне, людзі не перастануць змагацца з фальсіфікатарамі, са спробамі тэндэнцыйна, антыпатрыятычна перапісаць гісторыю Вялікай Айчыннай вайны.

Праўдзе вайны няма і не можа быць альтэрнатывы. Падмена паняццяў недапушчальная і небяспечная. Жыццё памяці – гісторыя народа, праўда вайны ў якой папаўняецца гэтым выданнем, яшчэ адной дакладнай старонкай ад жывых Сведкаў Гісторыі.

**Сцяпан ЛАЎШУК,**
**член-карэспандэнт НАН Беларусі,**
**доктар філалагічных навук,**
**прафесар**